# КАМП'ЮТЭР У РОЛІ... БІБЛІЯТЭКАРА

**«Мы ўсе вучыліся патроху»... — пісаў Паэт. Дадам: мы ўсе хадзілі ў бібліятэкі, і ўспаміны гэтыя, калі шчыра, не самыя прыемныя. Перш чым заняцца інтэлектуальнай працай, трэба было папрацаваць фізічна, перабіраючы шуфляды з доўгімі стосамі каталожных картак (а калі неахайны чытач ужо выдраў картку патрэбнай вам кнігі, дык наогул, лічы, усё прапала).**

Так было. Зараз сітуацыя пачала мяняцца. У Нацыянальнай бібліятэцы рэспублікі (вядомай у народзе як «Ленінка») прайшла прэзентацыя першай чаргі аўтаматызаванай інфармацыйнай бібліятэчнай сістэмы (АІБС). Электронны каталог!.. Акрамя каталагізацыі, сістэма ўключае яшчэ шэраг падсістэм (камплектаванне фондаў, бібліяграфічная дзейнасць і інфармацыйна-даведачнае абслугоўванне, міжбібліятэчны абанемент і інш.). Створана таксама база бібліяграфічных даных па праблемах культуры, ідзе збор інфармацыі для базы нацыянальных дакументаў.

Вось што расказала прэзідэнт навукова-вытворчай фірмы «ІНЕАК» **Нінель Ваднёва:**

— У 1991 годзе наша фірма правяла распрацоўку агульнасістэмных рашэнняў, пасля чаго ажыццявіла канкрэтныя праектныя работы. Над праектам у якасці экспертаў працавалі навуковыя супрацоўнікі інстытутаў тэхнічнай кібернетыкі, матэматыкі АН Беларусі. У распрацоўцы лакальных камп'ютэрных сетак дзейсную дапамогу аказалі спецыялісты чэшскай фірмы «CONET».

**— Нінель Іванаўна, раскажыце больш падрабязна аб самой сістэме.**

— Зараз у бібліятэцы дзейнічаюць 40 аўтаматызаваных рабочых месцаў, на якіх вырашаецца больш за 60 функцыянальных задач. Усяго ў лакальную сетку падключаны 23 машыны. Па мадэмнай сувязі ажыццяўляецца абмен з Магілёўскай абласной бібліятэкай. Дарэчы, у перспектыве мяркуем аўтаматызаваць рэспубліканскую бібліятэчную сістэму на ўсіх узроўнях, уключаючы абласны і раённы. Прынамсі, ужо ў трох абласных бібліятэках (мінскай, магілёўскай і гродзенскай) таксама ўведзена першая чарга АІБС.

Наладжваем сувязі з Расійскай дзяржаўнай бібліятэкай, у Расійскай кніжнай палаце набылі бібліяграфічную базу даных па друкаваных выданнях з 1985 па 1992 гады.

**— Хацелася б даведацца аб перспектывах далейшага развіцця сістэмы.**

— Першая чарга забяспечвае аўтаматызацыю ўнутрыбібліятэчных працэсаў. Яна значна палегчыла працу бібліятэкараў. У новым годзе сістэма будзе развівацца з арыентацыяй на чытача. Мяркуем падключыць да электроннага каталога даведачную сістэму, якая будзе функцыянаваць наступным чынам: з чытальнай залы праз камп'ютэр чытач зможа даслаць запыт аб патрэбнай кнізе ці запрасіць інфармацыю наконт літаратуры па той ці іншай тэме непасрэдна ў работнікаў кнігасховішча.

**...Ёсць меркаванне, што зроблены невялікі крок да цывілізаванага заўтра. Калі ЭВМ будзе дапамагаць нават у бібліятэцы, мы, можа, перастанем вучыцца «патроху»!..**

**Іна РЫМАШЭЎСКАЯ,**
**студэнтка факультэта журналістыкі БДУ.**